Я согласен с гродненским краеведом Ираидой Ефимовной Макеевой, что сначала нужно своих солдат похоронить. Еще не один десяток лежит их в местах боев. Я прекрасно понимаю и чувства ветеранов, когда они говорят «никаких памятников захватчикам».

Но никто и ничто не мешает нам всем участвовать в благородном деле поиска погибших советских солдат и восстановления истории тех событий. Александр Дударенок, про которого я уже упоминал, более десяти лет занимается сбором сведений о погибших, проводит раскопочные работы совместно со специализированным батальоном. И делает все это в свободное от основной работы время и за свои средства. На его счету более 500 найденных останков советских солдат, в основном на территории нашей области. И монументов немецким солдатам никто не предлагает ставить. Речь идет об обозначении мест захоронений. Рано или поздно все равно придется это делать. Потому что Беларусь – страна европейская и следующим поколениям жить по цивилизованным правилам и законам.

В нашем стремлении к становлению цивилизованного европейского государства трудно налаживать доверительные отношения с новыми поколениями, ни в чем и ни перед кем не повинными, отказывая им в праве поклониться праху своих предков, волею судеб втянутых в круговерть страшной войны и ставших ее жертвами. Межправительственное соглашение 1996 года между Федеративной Республикой Германия и Республикой Беларусь по уходу за военными могилами достаточно взвешенное и не несет нашей стране ни морального, ни материального ущерба. Суть соглашения сводится к тому, чтобы предоставить погибшим в войне солдатам с обеих сторон достойное последнее пристанище, обеспечить сохранность могил и должный уход за ними и в соответствии с положениями международного гуманитарного права. Все расходы, связанные с захоронениями, перезахоронениями, содержанием кладбищ своих воинов, немецкая сторона берет на себя.

Поминовение погибших – священный христианский долг, его выполнение ведет к примирению и добрососедству народов. Места захоронений советских и немецких солдат должны быть напоминанием живым о прошлом и заставлять задуматься о последствиях войны и насилия.

Сергей ПИВОВАРЧИК,
доцент кафедры археологии и этнологии ГрГУ

Незнаёмы водар над Беларуссю

Мікола Статкевіч – лідэр Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі «Народная Грамада», якая ўваходзіць у Еўрапейскую кааліцыю «Свабодная Беларусь».

У апазіцыйным руху М.Статкевіч ад самага пачатку яго існавання. Сёння ён госць «Біржы інфармацыі». З ім гутарыць наш карэспандэнт.

– Апошнім часам не толькі праціўнікі, але і прыхільнікі беларускай апазіцыі вельмі часта яе крытыкуюць. Прычым, крытыка гучыць, як аб'ектыўная, так і папулісцкая. А як на ваш погляд – на што здольна сённяшняя беларуская апазіцыя?

– Апазіцыя здольная толькі на тое, на што дазваляюць настроі ўнутры грамадства. Па сваіх магчымасцях яна не можа выйсці за межы свайго жадання. Справа ў тым, што сённяшнія праблемы апазіцыі – гэта вынік неспраўджаных чаканняў ад дэмакратыі ў канцы 80-х – пачатку 90-х гадоў. Тады грамадства паверыла ў дэмакратыю, як у сродак рэзкага павышэння дабрабыту жыцця, а ўзамен атрымала рэзкае пагаршэнне. У беларускім грамадстве слова «дэмакратыя» аказалася звязаным з эканамічным развалам, маёмасным абмежаваннем, карупцыяй і хаосам. Усё астатняе, што мы маем, – вынікі гэтага расчаравання.

На рэваншысцкай хвалі да ўлады прыйшоў чалавек, які зрабіў тое, што ён зрабіў з дэмакратыяй. Тое самае магло здарыцца і ў іншых краінах, і там таксама было гэтае расчараванне. Але там утрымаўся, па сутнасці, кансэнсус эліт. Яны прымусілі свае грамадствы не адступаць назад. Па сутнасці, гэта рабілася не дэмакратычным шляхам, а, хутчэй, гвалтам. Але там і апазіцыя, і людзі, якія знаходзіліся пры ўладзе, у шмат якіх пытаннях дзейнічалі сумесна. У нас гэтага не адбылося.

– І ўсё ж, калі вярнуцца да нашага пытання – яно турбуе сёння многіх, а вы, як мне здаецца, на яго не зусім адказалі.

– Ні ў адной краіне дзесяць гадоў запар не насаджаліся стэрэатыпы руху назад, да савецкага, бальшавіцкага, калі хочаце. Падругое, апазіцыя можа правіць і рэалізаваць сябе падчас выбараў, прапануючы сваю праграму. І, магчыма, зараз задача апазіцыі прапанаваць такую праграму, з якой людзі звяжуць свае надзеі на дабрабыт. Думаю, што шукаць новага тут нічога не трэба, а ісці дэмакратычным шляхам краінаў Прыбалтыкі, Украіны і той жа Грузіі. А ідэя вядомая – адзіная Еўропа і Еўрапейскі саюз. Гэта тым больш актуальна для Беларусі, паколькі мы засталіся адзінай краінай СНД, якой прапаноўвалі гэта членства яшчэ ў 1995 годзе, але наша кіраўніцтва гэтым не скарысталася. І калі апазіцыя падыме гэтую ідэю ў якасці сцяга, пачне казаць свайму народу пра еўрапейскую інтэграцыю, у якой можна вярнуць свой дабрабыт, то яна зможа змяніць стаўленне да сябе ў грамадстве. І калі стаўленне народа сапраўды памяняецца, то ўсё астатняе застанецца толькі тэхнічным пытаннем часу.

– Ідэя, як бы, зразумелая. Тым не менш, ужо за 10 месяцаў да выбараў у парламент апазіцыя крышыцца на дробныя кааліцыі. Як гэта разумець?

– Ведаеце, мне вельмі не падабаецца, калі людзі дэмакратычных перакананняў, самі стоячы ў баку, кажуць: «Когда же эта оппозиция, наконец, сделает то, потом другое...». У людзей такое ўяўленне, што апазіцыя – гэта нейкія людзі без страху, без сям'яў, а яны папросту абавязаны некаму нешта зрабіць. Але што мы самі зробім, калі вы стаіце і назіраеце з боку, ідзіце сюды. Усё можна зрабіць толькі разам.



Мікола Статкевіч, лідэр БСДП НГ, перад пачаткам дэманстрацыі ў Мінске, прысвечанай Дню Канстытуцыі, 15 сакавіка 2002 г.

Беларусь-Фота

Цяпер непасрэдна вернемся да вашага пытання. На жаль, сапраўды адбылася манапалізацыя дэмакратычнай ідэі. Пяць партыяў сабраліся разам і вырашылі, што яны ў сілу сваёй колькасці могуць манапалізаваць ідэю дэмакратыі. Гэта прыводзіць да раздраблення апазіцыі. Выйсці з гэтага можна толькі адным шляхам – шляхам перамоваў. Гэта і прапануе кааліцыя «Свабодная Беларусь». Я спадзяюся, што так і будзе, паколькі ўсе мы па сваіх перакананнях дэмакраты. І, дарэчы, я не стаў бы рабіць трагедыі з таго, што зараз адбываецца. Да выбараў яшчэ дзесяць месяцаў. Як ніколі зарана, апазіцыя пачала да іх падрыхтоўку. Думаю, што праз тры месяцы будзе абрана стратэгія і тактыка, высветліцца, хто мае рэальныя сілы на выбары.

– Але час ляціць значна хутчэй, чым думаюць нашы палітыкі.

– Любая кааліцыя можа праіснаваць пэўны перыяд часу. Як правіла, на гэта дзейнічаюць нейкія асабістыя моманты, часам нездаровыя амбіцыі, якія носяць разбуральны характар. Дзейнічае і знешні фактар: улада, спецслужбы і г.д. На мой погляд, нельга аб'яўляць выбарчую кааліцыю за такі час да выбараў. Вось глядзіце, улада ўжо прыняла законапраект аб тым, што партыйныя кааліцыі не маюць права ўдзельнічаць у выбарах. Аптымальны час для стварэння падобных кааліцый – канец вясны, пачатак лета. Дарэчы, Еўрапейская кааліцыя «Свабодная Беларусь» – гэта не выбарчы блок. Мы створым яго тады, калі ўлада ўжо не здолее на яго адрэагаваць. А пакуль будзе развівацца механізм кансультацый.

– І ўсё ж, слухаючы заявы прадстаўнікоў новаўтворанай «Маладой Беларусі», ёсць ужо паведамленні пра «Жаночую кааліцыю» – ствараецца ўражанне, што яны, наогул, пойдуць на выбары асобнымі блокамі.

– Думаю, што нікога не трэба прымушаць, каб ён да кагосці прымкнуў, трэба размаўляць, як з роўнымі. Яны да гэтага гатовы. І трэба, найперш, дамовіцца аб рэчах відавочных: агульнае вылуччэнне ў выбарчых камісіі, агульная сістэма назірання, адсутнасць крытыкі ў першым туры і падтрымка кандыдата, які выйшаў у другі тур.

Што датычыць «Жаночай кааліцыі», то гэта проста палітычная гульня. Такой кааліцыі няма.

– Адно з важнейшых пытанняў, якое турбуе выбаршчыкаў, – хто, акрамя Лукашэнкі?

– Мушу заўважыць, што зараз неабходна персаніфікацыя палітыкі. У заходняй Еўропе выбаршчыкі галасуюць за ўсё разам: і за партыю, і за асобу. У нашых рэаліях людзі, як правіла, прывыклі галасаваць толькі за асобу. І як бы не хацелася, лідэры палітычных партыяў павінны заяўляць пра сябе. Не адкрыю вам ніякай таямніцы, калі скажу, што ў сучасным свеце лідэры нацыі з'яўляюцца з дапамогай тэлебачання. Астатняе тлумачыць непатрэбна. Калі людзі не бачаць нікога, акрамя аднаго чалавека, то і казаць пра іншага лідэра складана. Як прыклад, тое, што ў нас у краіне было шмат лепшых саўгасаў, чым «Гарадзец», але ў тэлевізар патрапіў адзін старшыня саўгаса.

– Будзем лічыць, што апазіцыі ўдасца дамовіцца, яна рыхтуецца да выбараў, але не спіць і ўлада. Больш таго, апошнім часам усё часцей і часцей гаворка ідзе пра рэферэндум аб прадленні паўнамоцтваў на трэці тэрмін. Як павядзе сябе апазіцыя ў той сітуацыі, калі ўлада аб'явіць рэферэндум?

– Я думаю, што апазіцыя павінна рабіць тое, што і павінна – змагацца супраць рэферэндума. Мы павінны будзем заклікаць людзей галасаваць «супраць», арганізаваць назіранне за выбарамі, а калі іх будуць сфальсіфікаваны, арганізаваць масавыя акцыі пратэсту.

– Аднак, ужо даўно відавочна, што людзі не прыходзяць на акцыі пратэсту.

– Людзі прыходзяць на масавыя акцыі пратэсту толькі тады, калі адчуваюць, што гэта можа нешта змяніць. Думаю, што калі Лукашэнка навяжыцца на рэферэндум, то ў людзей узнікне такая неабходнасць. Задача апазіцыі ў такім выпадку – канцалідаваць гэтыя настроі і вывесць іх у форме публічных акцый.

– Даўно ўжо існуе меркаванне, што апазіцыя як бы адкалолася ад народа, займаецца чыстай палітыкай, а народ жыве сваімі праблемамі. Напрыклад, члены парламенцкай групы «Рэспубліка» змянілі сваю тактыку, спрабуюць наблізіцца да народа праз іх сацыяльныя і іншыя праблемы. Што вы думаеце на гэты конт?

– Наш вопыт сведчыць, што гэта немагчыма ў нашых умовах. Як можа палітычная партыя вырашаць сацыяльныя праблемы народа? Можна адзін раз купіць дзецям падарункі і адвесці іх у дзіцячы дом. Але гэта толькі праблемы. Дэпутатам групы «Рэспубліка» трэба вырашаць сацыяльныя праблемы ў парламенце. На настроі грамадства такія крокі не ўплываюць.

– А што сёння можа паўплываць на настроі грамадства?

– Народу трэба прапанаваць выйсце з тупіка. Я ўжо пра гэта казаў вышэй.

– А як прапанаваць, калі ідэі апазіцыйных партый нават немагчыма данесці да большасці беларускага народу.

– У нас няма іншага выйсця, трэба хоць праз улёткі, абыходзіць кватэры, размаўляць з людзьмі. Пажадана, каб гэтым усе займаліся.

– Колькі ўжо было гэтых улётак?

– Я разумею, што хочацца ўсё і адразу. Але так не бывае. Давайце ўзгадаем нашу найноўшую гісторыю: абранне Лукашэнкі на пасаду прэзідэнта Беларусі было аб'ектыўным. Таму што ён адпавядаў настроям тагачаснага беларускага грамадства. Зараз ён не адпавядае настроям сённяшняга беларускага грамадства. Грамадства чакае альтэрнатывы. Тыя ўлёткі, якія дзесяць гадоў таму не спрацавалі, зараз могуць адыграць цалкам адваротную функцыю. Асабліва, калі гэта альтэрнатыва будзе простая, зразумелая і відавочная.

– Лістоўкі – гэта, як бы, зразумела, але з другога боку – магутная дзяржаўная машына, у якой у руках усе рычагі ўздзеяння?

– У Лукашэнкі не ўсе рычагі ў руках. І, найперш, таму, што ён не можа забяспечыць людзям нармальнага жыцця. А ў людзей у галовах бурліць, і яны пачынаюць разумець, што нармальнае жыццё побач. А мы агароджаны ад яго, нас туды не пускаюць, і паміж гэтым жыццём і намі стаіць толькі адзін чалавек. І ніякая сістэма ўлады тут не дапаможа, бо тыя ж міліцыянты, вайскоўцы і астатнія – гэта, найперш, людзі, якія хочуць жыць нармальна. І калі народ на прэзідэнцкіх выбарах 80 працэнтаў прагаласуе супраць Лукашэнкі, ніводная сістэма фальсіфікацыі гэтага не праглыне. І задача апазіцыі пераканаць гэтыя 80 працэнтаў, а зрабіць гэта можна толькі прапануючы людзям пазітыўную альтэрнатыву.

Вось і зараз толькі 15 працэнтаў беларусаў згодны галасаваць за кандыдатуру, якая супраць Лукашэнкі. Астатнія пытаюць – а што вы нам прапануеце? Таму людзям трэба прапанаваць пазітыўную альтэрнатыву.

– Сёння шмат хто з людзей, нават з атачэння Лукашэнкі, лічаць сябе ў апазіцыі да прэзідэнта, паколькі не згодны з яго курсам. Ці працуюць апазіцыйныя партыі з такімі людзьмі?

– Гэта праўда. Апошнім часам з'яўляецца шмат новых людзей. Канешне, улада стараецца разбураць апазіцыю і робіць гэта, але наша задача сёння – будаваць хутчэй, чым улада разбурае. Нашай партыі гэта ўдаецца. Гэта, магчыма, для апазіцыйных партый самае галоўнае.

– Відавочна, што на выбары ў нашай краіне ўздзейнічае яшчэ і знешнепалітычны фактар, як з Захаду, так і з Усходу. На ваш погляд, які гэты ўплыў можа быць сёлета на парламенцкія выбары?

– Канешне, існуюць знешнепалітычныя рэсурсы і з Захаду, і з Усходу. Відавочна, што больш уплыў на гэта можа мець Расія. Калі паглядзець зараз, то відаць, што ў Расіі да ўлады прыйшлі людзі, якія не абцяжараны ніякімі белавежскімі пагадненнямі. І ў прынцыпе яны могуць паўздзейнічаць. Але ніхто ў нашу краіну дэмакратыю на руках не прынясе. Нават, калі Пуцін у адкрытую будзе крытыкаваць Лукашэнку, то гэта яшчэ не вырашыць пытанне. Толькі самі беларусы змогуць яе памяняць.

– Цалкам не выключана сітуацыя, калі яшчэ задоўга да выбараў не стане недзяржаўных СМІ. Прынамсі, дастаткова ўзгадаць БДГ, калі ім пошта і Саюздрук адмовілі ў распаўсюджванні, «Народную волю», ад якой патрабуюць тэрміновай выплаціць штраф у 25 тысяч долараў, і г.д. Апазіцыі ўвогуле не будзе дзе слова сказаць.

– Гэта вынікі звужэння рэсурсаў улады. Яна адчувае, што зямля пад нагамі калышацца. Улада слабне і пачынае паводзіць сябе больш жорстка. Напярэдадні мінулых прэзідэнцкіх выбараў газеты існавалі, недзяржаўныя арганізацыі мелі нейкія праекты, якія фінансаваліся з Захаду – і ўсе глядзелі на гэта нармальна. Чаму зараз ліквідаваны гэтыя арганізацыі, чаму ліквідуюць апошнія газеты? Таму, што страшна. Улада бачыць, што людзі самі шукаюць ёй альтэрнатыву, шукаюць выйсця, бо зразумелі, што ідуць шляхам у нікуды. Улада хоча не даць людзям даведацца пра гэтую альтэрнатыву, а апазіцыі, у сваю чаргу, данесці гэтую альтэрнатыву да людзей. Таму чакаць трэба самага рознага.

– І што можа быць далей?

– Сапраўды, нешта спее і ў атмасферы, і ў галовах людзей. Аднекуль даносіцца такі водар. Думаю, калі будзе аб'яўлены рэферэндум, то атрымаецца сітуацыя, калі кандыдат Лукашэнка змагаецца з кандыдатам Нелукашэнка. А рэйтынг «супраць» Лукашэнкі ўжо ўдвая большы, чым «за» Лукашэнку. Калі ён украдзе перамогу у свайго канкурэнта, людзі адразу гэта зразумеюць. Людзей, паверце, не абманеш. А вось тады можа нешта выспець і здарыцца. Магчыма, нешта накшталт грузінскага варыянту. І гэта цалкам магчыма. Не трэба лічыць беларусаў занадта спакойнымі людзьмі, паверце. Могуць быць самыя непрадказальныя рэчы.


Гутарыў Міхаіл КАРНЕВІЧ

Августовский канал – серьезные перспективы

Чрезвычайный и полномочный посол Беларуси в Польше Павел Латушко посетил Подляское воеводство 13-14 января.

В ходе встречи с маршалком воеводства Янушем Кшижевским и вице-воеводой Ежи Пульяновичем особое внимание было уделено обсуждению конкретных мер по началу реконструкции Августовского канала, сообщили БелаПАН в пресс-службе МИД. Посол проинформировал собеседников о принятом президентом Беларуси Александром Лукашенко решении о реконструкции канала и завершении соответствующих работ к 1 июня 2006 года.

Позитивную оценку со стороны руководства региона получило решение, принятое на встрече сопредседателей белорусско-польской межправительственной комиссии по трансграничному сотрудничеству в Каменце (Брестская область) в декабре 2003 года, об открытии 5 пограничных переходов на совместной границе.



13 января состоялась встреча посла Беларуси с руководством Белорусского общественно-культурного общества в Польше. В ходе встречи были обсуждены итоги сотрудничества в 2003 году и перспективные направления на 2004 год. Особое внимание уделено необходимости взаимодействия по организации белорусских культурных мероприятий на Белосточчине, в том числе предстоящего 21 февраля гала-концерта Всепольского фестиваля «Белорусская песня 2004». В концерте планируется участие коллективов «Хорошки» и «Сябры» из Беларуси.

Андрей СЕРЕДА, БелаПАН

У мусульман Слонима – праздник

В августе нынешнего года мусульмане Слонима планируют отметить 200-летие городской мечети и 10-летие со дня ее возрождения.

Как сообщил БелаПАН председатель Слонимской мусульманской общины Сулейман Байрашевский, здание городской соборной мечети было построено в 1804 году и сожжено нацистами в 1944 году. «Так как на ее месте впоследствии был построен жилой дом, власти предоставили общине другое здание, в котором десятый год размещается исламский храм», – сказал С.Байрашевский.

По его словам, татары в Слониме появились в начале XIV века. С 1717 до 1952 года в городе существовала Татарская улица, а молитвенный дом открылся в 1765 году. «За период с 1939 года, когда в городе проживало около 500 мусульман, численность общины сократилась до 124 человек. Это связано с репрессиями НКВД, а также выездами татар на Запад и в Польшу в 1944 и 1946 годах. Вот почему за пределами города слонимских татар проживает намного больше, чем сейчас в городе», – отметил С.Байрашевский.

Вместе с тем, по его словам, с 80-х годов прошлого века прекратился отток татар из города, так как с 1992 года в Слониме работает воскресная школа для детей, которые изучают арабский язык, коран, историю и культуру ислама.

Летом нынешнего года мусульманская община предполагает также провести день поминовения предков и на татарском кладбище благоустроить могилы воинов, погибших в годы первой мировой войны.

Кроме того, как сообщил С.Байрашевский, недавно на торжествах, посвященных его 60-летию, интересное предложение высказал член правительства Республики Татарстан (Россия), руководитель торгово-экономического представительства этой российской автономии в Беларуси Ирэк Гафиятулин. «Он заявил, что для Слонимского района Татарстан может поставлять газ на 30 процентов дешевле, чем для остальной Беларуси.

Марат ГОРЕВОЙ, БелаПАН

«Республика» предлагает единый принцип

Депутатская группа «Республика» Палаты представителей Национального собрания Беларуси предлагает до середины февраля провести «круглый стол» и обсудить на нем единые принципы и подходы по консолидации усилий и координации действий всех демократических сил страны.

Переговоры должны вестись «на основе равноправия, открытости и взаимного уважения». Это предложение «Республики» обнародовали 19 января во время презентации единого списка кандидатов в депутаты парламента от Народной коалиции «5+» пресс-секретарь группы Владимир Дзюба. Никто из депутатов «Республики» на презентации не присутствовал.

«Наша Родина находится на пороге значимых политических событий. Приближаются парламентские выборы. Представители президентской администрации все чаще говорят о намерении провести референдум с целью изменить Конституцию и удержаться у власти. Не за горами и выборы президента Республики Беларусь. В этих условиях демократическое движение Беларуси как никогда обязано сплотиться для совместных действий во время предстоящих избирательных кампаний», – отмечается в заявлении.

«За годы противостояния режиму Лукашенко, – говорится в документе, – демократические силы приобрели значительный опыт, закалились, их сторонники по всей стране готовы к активным действиям и полны решимости победить. Но победа придет только при условии, что мы объединим наш опыт, скоординируем усилия и мобилизуем наших сторонников».

Отсутствие на презентации единого списка представителей «Республики» стало большой неожиданностью для представителей СМИ. Официально это было объяснено их визитом в Чехию. Однако в кулуарах говорят, что это связано с разногласиями, возникшими в последнее время между лидерами партий и депутатами.

По словам В.Дзюбы, «Республика» хотела бы создать «мягкую» коалицию из всех демократических политических блоков, объединив вместе с «5+» Европейскую коалицию «Свободная Беларусь», сформированную на основе Белорусской социал-демократической партии (Народная Грамада) и гражданской инициативы «Хартия-97», и недавно созданный молодежный блок «Молодая Беларусь», костяк которого составили активисты «Молодого фронта».

Между тем на пресс-конференции лидеры «пятерки» заявили, что не намерены ждать, «пока все дозреют до необходимости объединения».

Тем не менее, по его словам, пока единый список кандидатов открыт для всех и «пятерка» готова вести переговоры со всеми политическими силами, которые «заинтересованы в демократизации Беларуси».

Юрий ПОТЕМКИН, БелаПАН

Выбаршчыкі ратуюць дэпутата

Дэпутат Мастоўскага раённага Савету Аляксандр Пудаўкін застаўся без працы, яго скарацілі. Сам дэпутат лічыць, што ўлады кіраваліся палітычнымі матывамі, паколькі ён – сябра апазіцыйнай Партыі камуністаў Беларускай, не хавае сваіх поглядаў і дзейнічае ў сваёй акрузе вельмі актыўна. Выбаршчыкі пачалі збіраць подпісы, каб беспрацоўнага дэпутата аднавілі на пасадзе.

Аляксандру Пудаўкіну 38 гадоў, пяць апошніх ён у складзе партыі камуністаў. Жыве дэпутат у вёсцы Луна, дзе працаваў землеўпараднікам ад райвыканкаму. Дэпутаты райсавету лёгка згадзіліся даць дазвол на ягонае звальненне, супраць быў толькі Алесь Зарэмбюк, дарэчы – адзін з лідэраў новай кааліцыі «Маладая Беларусь».

Сам Зарэмбюк кажа, што «у нашым савеце яшчэ ёсць дэпутаты ад Партыі камуністаў Беларускай, але гэты чалавек вельмі не падобны на іншых дэпутатаўкамуністаў. Ён заўсёды актыўны, ён заўсёды задае балючыя, хвалюючыя пытанні».

Беспрацоўны дэпутат сказаў мне па тэлефоне, што на апошняй сэсіі 16 студзеня начальства яго заспакоіла: маўляў, будзем паўгоду атрымліваць дапамогу, а потым якая-небудзь праца знойдзецца.

Дэпутат Пудаўкін, тым не менш, працягвае настойваць на тым, «што гэта чыста палітычны заказ. Паколькі мы разам з жыхарамі вельмі актыўна адстойваем свае інтарэсы».

Аляксандр Пудаўкін у лістападзе дамогся, каб не закрылі Луненскі шпіталь, на якім раённыя ўлады вырашылі зэканоміць. У 28 вёсках свае подпісы пад пратэстам супраць закрыцця шпіталя паставілі больш за адну тысячу жыхароў. Пра гэта дэпутат напісаў у артыкуле «Шпіталь вымагае абароны» ў партыйнай газеце «Товарищ». Паводле дэпутата, гэты артыкул не спадабаўся старшыні райвыканкаму.

Старшыня раённага Савету Георгій Каробка адмаўляе палітычныя матывы звальнення Аляксандра Пудаўкіна. Ён кажа, што «тут абсалютна ніякіх палітычных матываў няма, таму што ў нас ад партыі камуністаў чатыры ці пяць чалавек у раённым Савеце. Гэта проста чыстая выпадковасць, што рэфармуецца служба, у якой ён быў пры сельскім савеце».

Радыё Свабода

Установлены причины падения самолета

Установлены причины катастрофы, произошедшей с самолетом «Вилга-35», обнаруженным в конце декабря 2003 года вблизи деревни Маркиши в Гродненском районе. По данным правоохранительных органов Беларуси, катастрофа произошла 29 марта 2003 года. На месте трагедии сначала были обнаружены два скелетированных трупа, затем появилась информация об обнаружении останков ещё двоих человек. Выяснением того, кто мог находиться в самолете, занимаются органы прокуратуры.

Как сообщили БелаПАН в Государственном комитете по авиации Республики Беларусь, эксперты считают, что легкомоторный самолет попал в поперечные воздушные массы. Так как высота полета была небольшой, из-за вибрации корпуса самолет зацепился за деревья, что и повлекло падение машины на землю.

Вячеслав БУДКЕВИЧ, БелаПАН

Ведай гісторыю Гродна




З археалагічнага камітэту да беларускай партызанкі: пратаіерэй І.Карчынскі і беларускі рух

Як не дзіўна, але ж вось гэтая, пасыпаная бітай цэглай плешывіна-скверык на месцы, дзе калісці ўздымалася адна з найпрыгажэйшых хрысціянскіх святынь Гродна: каталіцкая Фара Вітаўта, і яна ж – праваслаўны Сафійскі сабор, шмат што можа патлумачыць пра адносіны паміж беларускім нацыянальным рухам і праваслаўнай царквою ...

Да Першай Сусветнай вайны праваслаўная царква па большасці глядзела на «беларускае пытанне», як на польскую інтрыгу, ці, у лепшым выпадку, уціскала беларусаў у пракрустава ложа тэорыі «заходне-русізму»... Нічога дзіўнага, што ўжо гурток беларускай моладзі, які знаходзіўся пад апекай каталіцкіх ксяндзоў і дзейнічаў паўлегальна, некалькі разоў быў пад пагрозай раскрыцця менавіта з боку праваслаўных святароў. Нават пасля 1915 года, калі ў літаральным сэнсе праваслаўная царква на Гродзеншчыне па сваіх уплывах апынулася адкінутай у часы князя Вітаўта, праваслаўны клір па-ранейшаму ставіўся варожа да нацыянальных памкненняў беларусаў.

Той постаццю, якая злучыла паміж сабою праваслаўную царкву і беларускі рух, няхай толькі для агульнай барацьбы супраць польскіх уплываў, стаўся былы пратаіерэй Барыса-Глебскага манастыра Іаан Карчынскі. Айцец Іаан, будучы да вайны інспектарам царкоўна-прыхадскіх школ Гродзенскай праваслаўнай епархіі і пратаіерэем Барыса-Глебскага манастыра актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці краю: з'яўляўся сябрам праўлення Сафійскага праваслаўнага брацтва, адным з заснавальнікаў і старшынёй царкоўна-археалагічнага камітэту, шмат друкаваўся па гісторыі праваслаўя на Гродзеншчыне, а нават двойчы, у складзе дэпутацыі Сафійскага брацтва, быў на прыёмах у імператара Мікалая II і, наўрадці, у гэты час выказваўся прыхільнікам беларускасці.



Айцец Іаан Карчынскі – святачэннік, гісторык, беларускі партызан.

У 1915 годзе ён, як і большасць праваслаўных святароў, выехаў з Гродна ў эвакуацыю, у Маскву. Калі ў канцы вайны айцец Іаан вяртаецца на радзіму, перад ягонымі вачыма ўстаюць не толькі зруйнаваныя хаты і скалечаная гаспадарка, але і цэрквы, перароблены на касцёлы. І не важна, што большасць з іх раней былі каталіцкімі ці ўніяцкімі храмамі. Для І.Карчынскага, як і для ўсіх праваслаўных вернікаў, гэта з'ўлялася праявай польскай экспансіі, якую трэба было спыніць любой цаною. Як раз у сярэдзіне кастрычніка 1918 года адбылася ўрачыстая перадача нямецкім гарнізонным святаром ксяндзом Огуркай Сафійскага сабору, былой фары Вітаўта, у карыстанне каталікам. Магчыма, што менавіта рэвіндыкцыя Сафійскага сабору ў Гродне – перадача яго каталіцкай царкве, падштурхнула айца Іаана зноў да актыўнай грамадскай працы ўжо на новай, беларускай глебе.

Своеасаблівая «беларусізацыя» І.Карчынскага пачалася яшчэ ў 1917 годзе, калі ён увайшоў у склад Саюза беларускага праваслаўнага духавенства. Ужо ў Гродне І.Карчынскі становіцца сябрам мясцовай беларускай управы і адным з заснавальнікаў таварыства «Бацькаўшчына», а, нават, што праўда, беспаспяхова, вылучаецца ад блоку «Беларускае грамадства» на выбарах у Гродзенскую гарадскую раду. Адбываюцца перамены і ў ягоных поглядах наконт беларускасці. Калі яшчэ ў канцы 1918 года айцец Іаан выступаў супраць увядзення беларускай мовы ў царкву, як несвоечасовага кроку, маўляў, праваслаўная служба адбываецца на старажытна-славянскай мове і так добра зразумелай беларусам, то ўжо вясной 1919 года ён сам пачынае весці службу па-беларуску. Адначасова ў красавіку таго ж года І.Карчынскі быў кааптаваны ў склад літоўскай Тарыбы (Дзяржаўнай Рады), што запачаткавала ягонае сбліжэнне з Літвой. Аднак, ці не галоўнай справай для айца Іаана на гэты момант заставалася абарона Сафійскага сабору. Барацьба ішла настолькі востра, што І.Карчынскі, не абыякавы да гісторыі чалавек, не спыніўся нават перад тым, каб знішчыць лацінскі надпіс на мармуровай табліцы ў былой Фары Вітаўта і гэтым самым заспрэчыць правы каталікоў на гэты гродзенскі храм.

Нічога дзіўнага, што ўжо праз два месяцы пасля ўсталявання польскай улады айцец Іаан апынуўся арыштаваны і вывезены з Гродна. Наколькі гэтая постаць была не да спадобы новай уладзе, бачна па тым, што, калі ў сярэдзіне кастрычніка І.Карчынскі вяртаецца ў горад, ужо праз два дні кіраўнік мясцовай дыфензівы ізноў адсылае яго ў лагер, адкуль той быў вызвалены, толькі дзякуючы інтэрвенцыі варшаўскага царкоўнага савету. Летам 1920 года, ужо пры савецкай уладзе, святар зноў на кароткі час прыязджае ў Гродна, але ж з набліжэннем польскіх войскаў ён перабіраецца ў Коўна, дзе становіцца адным з арганізатараў беларускага антыпольскага партызанскага руху: І.Карчынскі з'яўляўся сябрам штабу атамана «Хмары» – В.Разумовіча ў Мерычы, выконваючы абавязкі сувязнога з праваслаўнай царквою на Гродзеншчыне, і, адначасова, у якасці праваслаўнага капелана служыў у беларускім батальёне. Магчыма нават, што праваслаўны пратаіерэй быў сябрам масонскай у ложы «Беларускае брацтва» ў Коўне. І.Карчынскі зноў бярэцца за пяро, але на гэты раз, каб пісаць мемарыялы ў справе прыціснення праваслаўнай царквы на Гродзеншчыне, ды антыпольскія брашуры, накшталт: «Чаго чакаць беларусам, асабліва праваслаўным, ад Польшчы?», «Гутарка дзеда да малодшых». У канцы 1920 года айцец Іаан едзе ў Рыгу, дзе сустракаецца з кіраўніком ураду БНР В.Ластоўскім, якога намаўляе на саюз з Літвою, а ўжо ў верасні 1921 года ён выступае з прывітальнай прамовай ад імя беларусаў Літвы на беларускай канферэнцыі ў Празе ...

Апошнія звесткі аб айцы Іаане Карчынскім датычацца жніўня 1932 года, калі той у якасці прадстаяцеля Епархіяльнага Савету браў удзел у заснаванні Багародзіцкай царквы ў Коўне. На жаль, нам не вядомы ягоны далейшы лёс – магчыма, І.Карчынскі пазней пераехаў у Парыж, дзе, па некаторых звестках, захаваліся ягоныя ўспаміны. Гродзенцам жа застаўся ўтульны скверык, што, праўда, адзін час трошкі перакапаны праз сучасных археолагаў, дзе нават зараз нельга ўсталяваць крыж...

Андрэй ЧАРНЯКЕВІЧ

Памёр Чэслаў Немэн

Заканчэнне. Пачатак на стар.1

«Рак перамог генія», «Ён быў для нас каралём», «Пустым застаўся гэты свет», «Гэта музыка застанецца з намі» – з такімі загалоўкамі ў мінулы панядзелак выйшлі польскія газеты. – Ужо ніколі польская музыка не стане такой, як была – цытуе папулярнае выданне знакамітага музычнага крытыка і журналіста Войцеха Мана.



Чэслаў Немэн быў музыкантам, які ў смутныя гады сацыялістычных рэалій перавярнуў польскі шоў-бізнэс дагары нагамі, і не паддаўся новай камерцыялізацыі, якая прыйшла ў Польшчу разам з капіталізмам. Ён ніколі не падстрайваўся пад камуністычную моду і ідэалогію, за што часта атрымліваў насмешкі і здзекі ў свой бок ад афіцыйных СМІ – чаму гэта ён ходзіць у такіх рознакаляровых касцюмах і ці яго доўгія валасы насамрэч яго, а не парык...

Ягоная музыка мала цікавіла чыноўнікаў ад культуры. Але гэта працягвалася толькі да 1963 года, пакуль ён безтурботна спяваў сваю вядомую песню «Пад папугамі». А потым былі новыя песні: «Дзіўны той свет» і «Палаючая стадола». І шмат іншых твораў, якія выклікалі шок і захаплялі. Тады ён стаў не проста выканаўцам, ён стаў новай з'явай у польскай культуры.

І хаця пазней, з гадамі, Немэна толькі зрэдку можна было пабачыць на канцэртах і фестывалях, яго песні і манера выканання, сам спявак сталі настолькі важным і падражальным, што кожны малады выканаўца – і нават міністр культуры не маглі не лічыцца з ім.

Раней скрытыкаваны за каляровыя касцюмы і доўгія валасы, цяпер ён пастаянна вылучаўся намінантам на найлепшага польскага музыканта. Праўда, гэта яго быццам зусім не турбавала, бо ён проста іграў і спяваў.

Старэйшае пакаленне гродзенцаў, канешне, памятае зорак польскай эстрады, якія ў часы ПНР з ахвотай выступалі на сцэнах перад братнім савецкім народам. Хто з таго пакалення не памятае Марылі Радовіч і «Чырвоных Гітар» з Севярынам Краеўскім? Гэта было.

Чэслаў Немэн ніколі не хацеў і ніколі не ездзіў у Савецкі саюз з гастролямі. Толькі аднойчы ў 1977 годзе ён пабываў у Мінску, дзе адбыліся некалькі ягоных канцэртаў у Палацы спорту. Відавочцы дагэтуль узгадваюць чалавека-чараўніка, заціснутага горамі сінтэзатараў, якія тады пабачылі ўпершыню ў жыцці. Быў шок і зачараванне. Але далей Мінска з гастролямі ён нікуды не паехаў.

Чаму? Можа, таму, што Чэсяк Выдрыцкі ўсё дзяцінства і юнацтва правёў у родных Старых Васілішках, дзе нарадзіўся 16 лютага 1939 года. Яшчэ паўгода тады была Польшча, потым – Заходняя Беларусь, і пазней – бальшавікі. Потым ізноў была вайна, фронт за фронтам, ізноў прыйшлі вызваліцелі. – Не хачу туды ехаць. Хачу аб усім забыць – цытаваў мне словы Немэна польскі дыпламат, які некалькі гадоў таму хацеў запрасіць музыканта ў Беларусь.

Гэта была праўда, але не ўся праўда. У архіўных кадрах, знятых у 60-я і 70-я гады, можна ўбачыць Чэслава Немэна, які выступаў на сцэне... у беларускай льняной вышыванцы. Дагэтуль уся Польшча намагаецца паўтарыць за ім яго непадробнае ўсходняе «Л», недаступнае для звычайнага «пшэка».

У 1958 годзе сям'я Выдрыцкіх вырашыла ўсё ж пераехаць у Гданьск. І дзякуючы гэтаму Польшча атрымала, можа быць, найвялікшы музычны талент у пасляваенны час. Так цяпер пішуць пасля яго смерці польскія крытыкі. Бо палякі, відаць, як і іншыя народы, не пытаюцца аб паходжанні талентаў, якія ўзбагачаюць іх культуру. У польскіх школьных падручніках палякамі заўсёды застануцца таксама народжаныя ў Беларусі Міцкевіч, Касцюшка, Дамейка і Ажэшка.

І не трэба на гэта крыўдзіцца. Хай лепей Беларусь хоць на нейкі час узгадае хоць пра аднаго з сваіх выхаванцаў. Калі цяпер час гэтаму не спрыяе, то заўсёды можна памятаць, што гродзенская музычная вучэльня, якая раней мясцілася ў падворку вуліцы Ажэшкі, мусіць насіць імя Чэслава Выдрыцкага-Немэна. Самага знакамітага свайго вучня, якога калі-небудзь выпусціла са сваіх сцэнаў у гэты свет.

Спецыяльна для «Біржы інфармацыі» Цэзары ГАЛІНСКІ

Аўтар, шматгадовы супрацоўнік «БІ», які яшчэ да нядаўняга часу працаваў уласным карэспандэнтам «Gazety Wyborczej» у Мінску.

Союз Балтийских городов ждет предложений

Комитет официальных представителей СБГ в декабре прошлого года принял решение о беспрепятственном принятии городов Минской, Гродненской, Витебской и частично Брестской областей в члены СБГ.

Для этого достаточно подать заявление. Города, желающие поскорее стать членами Союза, должны успеть с подачей заявления до 1 февраля 2004 года.

Что касается г. Гродно, пока единственного в Беларуси члена СБГ, то подавать заявки в секретариат на реализацию своих проектов могут также частные предприниматели, госпредприятия и другие организации. Предпочтение будет отдано серьезным проектам социальной и экологической направленности. Очередная конференция, где будут рассмотрены данные вопросы, пройдет 4-6 марта.

По словам председателя координационного совета устойчивого развития области Франца Авдея, членство города в СБГ может принести его жителям много пользы. Однако, несмотря на почти годичное членство Гродно, никаких позитивных изменений не произошло. Почему наш город не воспользовался своим положением, почему до сих пор не подано ни одной заявки на участие в той или иной программе? «Чиновники не желают брать на себя хлопоты».

Но даже теперь мы можем принять участие в программе «Содействие устойчивому развитию экономики приграничных районов». Данный проект рассчитан на участие в нем Беларуси, Литвы и Латвии. Европейский фонд выделяет на это хорошее дело 11 млн. евро. Однако для реализации проекта городам-участникам (они должны быть как минимум из двух стран) надо внести 25% от указанной суммы. И все равно, по мнению Авдея, это очень выгодно.

А впрочем, выбор программ, предложенных СБГ к реализации с финансированием достаточно широк. Это и «Совместная работа регионов в различных сферах»(туризм, образование, бизнес и т.д.), и «Обеспечение эффективной защиты границ», и «Содействие сотрудничеству и совместной работе жителей приграничных регионов».

Станислава КАЗИМИРЧИК

Так трымаць

15 студзеня ва ўтульнай зале СШ№25 адбылося ўшанаванне прызёраў алімпіяд па беларускай і рускай мовах сярод школьнікаў.

Узнагароджана было 25 вучняў, разам з настаўнікамі. Усе ўзнагароджаныя вучні з'яўляюцца пераможцамі алімпіядаў Ленінскага і Кастрычніцкага раёнаў Гродна і Гродзенскай вобласці. Віншавалі пераможцаў загадчык аддзела адукацыі Гродзенскага гарвыканкама Вера Родзіна,старэйшы выкладчык кафедры рускай мовы Гродзенскага дзяржуніверсітэта Галіна Жданеня, старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі «Таварыства беларускай мовы» імя Францыска Скарыны Алесь Місцюкевіч і многія другія.

Ва ўрачыстай абстаноўцы былі выказаны словы падзякі настаўнікам, якія прывіваюць любоў да роднай мовы і даюць добрыя веды.

Ганаровыя граматы за лепшае веданне роднай беларускай мовы атрымала вучаніца 9 класа гімназіі №1 Таццяна Смольская і Сяргей Астрашэўскі, вучань 10 класа СШ №9. Яны сталі пераможцамі абласной алімпіяды. У падарунак вучні атрымалі кнігі.

Так трымаць, шаноўныя школьнікі, паколькі менавіта вы з'яўляецеся прадаўжальнікамі і носьбітамі сваёй роднай мовы і культуры.

Ларыса ВОРАН

Победила дружба!

17 января. СВК «КСМ - Неман» (Гродно) ВК «Дружба - ПГУ» (Новополоцк) – 3:1.

18 января. СВК «КСМ - Неман» – ВК «Дружба - ПГУ» – 1:3.



Пожалуй, не было (по крайне мере в нынешнем чемпионате) более принципиального и «важного» соперника для гродненского «Немана», чем волейболистки из Новополоцка. Ведь именно «Дружба» и является своеобразным плацдармом для штурма лидирующей группы чемпионата. Потому как наши девочки находятся гораздо ниже своих соперниц в турнирной таблице. Как показала игра (правда, не совсем результат), наши волейболистки сумели-таки достойно выступить, учитывая предматчевую интригу.

Первая партия выдалась на удивление динамичной. Игра той и другой команды выделялась зрелыми действиями с небольшим процентом брака. Однако, как известно, в волейболе ничьей не бывает, поэтому победил тот, кому чаще улыбалась фортуна. В данном случае это гости из Новополоцка (20:25). Кстати, госпожа «Удача» в этот вечер была на редкость справедлива. Уже во второй партии при потрясающей зрелищности (волейболистки, порой, доставали фантастические мячи) у «Немана» был «дефицит» нелепых и обидных ошибок (25:23). Следующая партия являлась переломной в матче. Видно, об этом догадывались и тренеры команд (Юрий Бондарь – главный тренер ВК «Дружба – ПГУ» и Татьяна Тупицына – тренер «Немана»), игра проходила в спокойном русле, и те, и другие пытались «выехать» на чужих ошибках. Только хороший старт Немана в начале партии позволил избежать нервной концовки (25:21). Тот же начальный отрезок, только уже в четвертом раунде, проведенный нашими волейболистками, выдался плодотворным. Это удалось благодаря буквально взорвавшейся юной волейболистке Ирине Ковалевой. Итог четвертой партии – 25:20.

